ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ
па правядзенні выбараў
у Каардынацыйную Раду ІІІ склікання

# ПРЭС-РЭЛІЗ

11 траўня 2024 года г. Варшава

Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную Раду ІІІ склікання (далей - Выбарчая камісія) ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Андрэя Атаманчука, Ярослава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай і Алены Філатавай па стане на 15:00 (CET) 1 траўня 2024 года ІНФАРМУЕ:

1. Адбыліся наступныя змены ў спісах кандыдатаў выбарчых суб’ектаў:

- Кандыдаты спіса выбарчага суб’екта “Независимые белорусы” Уладзіслаў Салавей (пад нумарам 2), Мікалай Бойка (пад нумарам 12) і Андрэй Гаўрылюк (пад нумарам 14) выключаны са спісу кандыдатаў у адпаведнасці з рашэннем Выбарчай камісіі ад 2 траўня 2024 года. Падставай для выключэння кандыдатаў са спісу стаў адпаведны зварот, накіраваны ініцыятарам выбарчага суб’екта 1 траўня 2024 года на адрас Выбарчай камісіі.
- Кандыдат спіса выбарчага суб’екта “Аб’яднанне палітычных партый Народная Грамада і Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя “Салідарнасць” “Tsishkevich Olga” пад нумарам 10 выключана са спісу кандыдатаў у адпаведнасці з рашэннем Выбарчай камісіі ад 2 траўня 2024 года. Падставай для выключэння кандыдата са спісу стаў адпаведны зварот, накіраваны ініцыятарам выбарчага суб’екта 2 траўня 2024 года на адрас Выбарчай камісіі.
- Кандыдат спіса выбарчага суб’екта “Каманда Латушкі і Рух “За Свабоду” Алену Пуцыковіч пад нумарам 45 выключана са спісу кандыдатаў у адпаведнасці з рашэннем Выбарчай камісіі ад 10 траўня 2024 года. Падставай для выключэння кандыдата са спісу стаў адпаведны зварот А. Пуцыковіч ад 9 траўня 2024 года на адрас Выбарчай камісіі.
- Кандыдат спіса выбарчага суб’екта “Блок Пракоп’ева-Ягорава” Яраслаў Гамолка пад нумарам 32 выключаны са спісу кандыдатаў у адпаведнасці з рашэннем Выбарчай камісіі ад 10 траўня 2024 года. Падставай для выключэння кандыдата са спісу стаў адпаведны зварот, накіраваны ініцыятарам выбарчага суб’екта 9 траўня 2024 года на адрас Выбарчай камісіі.
- Кандыдат спіса выбарчага суб’екта “Наша справа” Тацьцяна Шостак пад нумарам 11 выключана са спісу кандыдатаў у адпаведнасці з рашэннем Выбарчай камісіі ад 11 траўня 2024 года. Падставай для выключэння кандыдата са спісу стаў адпаведны зварот, накіраваны кандыдатам 10 траўня 2024 года на адрас Выбарчай камісіі.
- Кандыдат спіса выбарчага суб’екта “Воля” Ігар Турцэвіч пад нумарам 5 выключаны са спісу кандыдатаў у адпаведнасці з рашэннем Выбарчай камісіі ад 11 траўня 2024 года. Падставай для выключэння кандыдата са спісу стаў адпаведны зварот, накіраваны кандыдатам 10 траўня 2024 года на адрас Выбарчай камісіі.
- Выбарчы суб’ект Аб’яднанне палітычных партый "Народная Грамада" і "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя" “Салідарнасць” 9 траўня 2024 года звярнуўся з запытам удакладніць прозвішчы ў спісе і дадаць напісанне іх кірылічным алфавітам. Выбарчая камісія прыняла рашэнне задаволіць гэтую просьбу і дадаць у спіс дадзенага выбарчага суб’екта напісанне прозвішчаў у тым ліку і кірыліцый, без унясення зменаў у парадак і існасць асобаў.

2. Галасаванне па выбарах у Каардынацыйную раду 25-27 траўня 2024 года будзе адбывацца наступным метадам: 1) грамадзянін Беларусі спампоўвае на свой мабільны тэлефон адпаведную прыладу (спасылкі для спампоўкі будуць размешчаны на афіцыйных каналах Каардынацыйнай рады, іншых палітычных суб'ектаў і вядомых СМІ); 2) выбаршчык павінен будзе прайсці працэдуру ідэнтыфікацыі пасродкам фотаздымання ўласнага твару і пашпарту (пасродкам электроннай прылады); 3) кожны грамадзянін Беларусі зможа прагаласаваць толькі адзін раз за адзін спіс выбрачага суб'екта; 4) размеркаванне мандатаў паміж выбарчымі спісамі будзе ажыццяўляцца пасродкам метада Хэйра-Німейера; 5) зыходзячы з прыярэтэту бяспекі правядзення выбарчай кампаніі назва электроннай прылады, спасылка на яе, звесткі пра праходжанне тэхналагічнага аўдыта, сертыфікацыя і іншыя істотныя звесткі будуць апублікаваны толькі за 5 дзён да выбараў.

3. Выбарчая камісія звяртае ўвагу выбаршчыкаў, што не ўсе размешчаныя ў сродках масавай інфамацыі апытанні, якія тычацца падтрымкі кандыдатаў, адпавядаюць рэчаіснасці. Выбарчая камісія адзначыла выпадкі недобрасумленнай канкурэнцыі падчас перыяду агітацыі, а менавіта выкарыстанне аўматаваных сістэм штучнага інтэлекту (ботаў).

Пад час агітацыйнага перыяду Выбарчая камісія назірае за выпадкамі маніпулятыўных апытанак, рэйтынгаў і інфармацыйных укідаў з мэтай дэскрыдтацыі чальцоў выбарчых суб'ектаў.

Таму Выбарчая камісія звяртаецца да ўсіх удзельнікаў выбарчага працэсу з заклікам прытрымлівацца прынцыпаў здаровай канкурэнцыі і не ўжываць брудныя сродкі ўздзеяння на грамадскае меркаванне.

Таксама Выбарчая камісія звяртаецца да выбаршчыкаў з заклікам крытычна ставіцца да інфармацыі, правяраць яе, а ўсялякія апытанкі, рэйтынгі і параўнальныя вынікі не ўспрымаць, як канчатковыя ці сапраўдныя экзітполы. Падобны кантэнт уводзіць у падман, ствараецца часам для маніпулявання грамадскім меркаваннем і для аказання падсвядомага ціску на ваш канчатковы выбар.

4. Выбарчая камісія паведамляе пра ўдзел у выбарчым працэсе міжнародных назіральнікаў. Па пытаннях акрэдытацыі СМІ і назіральнікаў ад грамадскіх, палітычных і іншых суб'ектаў звяртацца на мейл elections@rada.vision

Калі ў выбарчых суб'ектаў з'явяцца пытанні адносна асобаў, якія паведамляюць пра сябе як аб назіральніках, просьба неадкладна звярнуцца ў Выбарчую камісію па пытанні верыфікацыі гэтых асобаў.